# ARCHE

пачатак



## ПАЛЕСЬСЕ:
## народы, улады, войны

ARCHE 3 (102)
сакавік 2011

3 2011 ARCHE 3 2011

**Навуковы, навукова-папулярны, грамадзка-палітычны і літаратурна-мастацкі часопіс «ARCHE Пачатак» выдаецца зь верасьня 1998 году штомесяц.**

**РЭДАКЦЫЯ:**

**Валер Булгакаў** — галоўны рэдактар
**Аляксандар Пашкевіч** — намесьнік галоўнага рэдактара
**Віктар Жыбуль** — рэдактар
**Алена Казлова** — сакратарка рэдакцыі
**Аляксандра Макавік** — рэдактар
**Сяргей Бахун** — распаўсюднік

Укладаньне нумару — **Ірына Чарнякевіч**

**ARCHE is a Partner of European Cultural Journals Network Eurozine (www.eurozine.com)**

**Адрас для допісаў:** ARCHE, а/с 3, 220018, Менск-18.
**E-mail:** arche@arche.org.by.
**Тэл.** (029) 550-79-69.

Часопіс можна замовіць у распаўсюднікаў:

**Баранавічы** — Руслан Равяка, п/с 13, 225409, Баранавічы-9, тэл. (029) 767-20-37.

**Берасьце** — Ігар Бараноўскі, тэл. (0162) 25-61-55, (029) 8-000-157.

**Віцебск** — Барыс Хамайда, тэл. (0212) 34-52-41.

**Гародня** — Эдвард Дмухоўскі, тэл. (029) 133-87-17.

**Гомель** — Ларыса Шчыракова, тэл. (029) 341-66-94;
Дзяніс Федарэнка, тэл. (029) 733-55-22.

**Магілёў** — Алесь Асіпцоў, тэл. (0222) 25-57-85, (029) 625-57-85.

**Мазыр-Калінкавічы** — Вадзім Дамарад, тэл. (029) 732-75-93

**Маладэчна** — Алесь Кштальтны, тэл. (044) 792-36-88, (033) 602-19-74.

**Менск** — Сяргей Бахун, тэл. (029) 724-54-56, 624-54-56.

**Наваполацак** — Ірына Бельская, тэл. (029) 296-15-73.

Шукаем распаўсюднікаў зь іншых мясьцінаў.

**Падпіска на часопіс «ARCHE Пачатак» прымаецца ўва ўсіх аддзяленьнях «Белпошты».**

**Заснавальнік:** Андрэй Дынько.
**Выдавец:** установа «Рэдакцыя часопісу «Архэ-Пачатак».
Пасьведчаньне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 530 ад 4.05.2001.
ISSN 1392-9682

**Юрыдычны адрас:** вул. Нававіленская, 24/1А, каб. 2П, 220053, Менск.
Цана дамоўная.
Рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе рукапісаў.
Рэдакцыя рэдагуе матэрыялы, прынятыя да друку.

Падпісана ў друк 28.03.2011.
Выхад у сьвет 31.03.2011. Фармат 70х100 1/16.
Друк афсэтны. Гарнітура Школьная.
Наклад 600 асобнікаў. Замова

Надрукавана з гатовых дыяпазытываў заказчыка ў друкарні ТАА «Палікрафт», вул. Кнорына, 50, 220103, Менск.
ЛП № 02330/0131696 ад 30.04.2004.

У афармленьні першай старонкі вокладкі выкарыстаная наступная мапа: Partie de Lithuanie ou est le palatinat de Nowogrodeck Litawiski subdivisé en ses chastellenies, le palatinat de Bressici en Polesie, avec les duchés de Neswies et Slusck et partie du palatinat de Minsk / Par le Sr. Sanson ; A. Peyrounin sculp. Paris, 1665.
Дызайн вокладкі — **Ягор Шумскі**.

© «ARCHE Пачатак», 2011

**Падпісны індэкс 00345**

**ARCHE on-line:** http://arche.by

ARCHE
пачатак

3–2011

# ЗЬМЕСТ

## ПРАДМОВА

**ІРЫНА ЧАРНЯКЕВІЧ. У пошуках Палесься . . . 7**

## ЭТНАЛЁГІЯ

**ФЁДАР КЛІМЧУК. Загадкавае Палесьсе . . . 13**
Гутарка зь дзядзькам Лукашом . . . 15
Назва «Палесьсе». Паходжаньне слова . . . 16
Палесьсе і прарадзіма славянаў . . . 17
Тэрыторыя Палесься і яго рэгіёны . . . 18
Пошукі Палесься . . . 22
Палесьсе ад дзядоў–прадзедаў. Якое яно? . . . 24
Розныя характарыстыкі Палесься . . . 25
Дык што ж гэта такое — Палесьсе? . . . 26
**ВОЛЬГА ЛАБАЧЭЎСКАЯ. «Мабыць, я вельмі захапляюся Палесьсем...». Пра фатаграфічную спадчыну этнографа Ісака Сербава . . . 28**
**ГАННА ЭНГЕЛЬКІНГ. Паміж аповедам і пісаньнем. Апавяданьні Ніны Лушчык-Ільянковай як маніфэст ідэнтычнасьці . . . 52**
**Апавяданьні з рукапіснай спадчыны Ніны Лушчык-Ільянковай . . . 61**
Купальская ноч на Росах . . . 61
Рамантычны касір . . . 62
**САФРОНІЙ ЖЛОБА. Сучасная палеская вёска: паміж традыцыяй ды інавацыямі . . . 65**

## ЭТНАЛІНГВІСТЫКА

**МІКАЛАЙ АНТРОПАЎ. Традыцыйная этнакультура Палесься . . . 72**
**ТАЦЯНА АГАПКІНА. Традыцыйныя палескія забароны, зьвязаныя з дрэвамі . . . 89**
**ЛЮДМІЛА ВІНАГРАДАВА. «Знаючыя людзі» ў палескай дэманалёгіі . . . 101**
I. Як стаць «знаючым» . . . 102
II. Музыкант . . . 104
III. Мельнік . . . 105
IV. Ганчар . . . 106
V. Будаўнікі . . . 107
VI. Пастух . . . 111
VII. Павітуха . . . 112
VIII. Цыганы . . . 114
IX. Людзі, якія ўмеюць адганяць градавую хмару . . . 115

## ЭТНАСАЦЫЯЛЁГІЯ

**ГАННА ЭНГЕЛЬКІНГ. Палесьсе Юзафа Абрэмбскага . . . 118**

**ЮЗАФ АБРЭМБСКІ. Народ бяз бацькаўшчыны . . . 137**

Этнічная праблема Палесься . . . 137
Палесьсе і палешукі ва ўяўленьнях суседзяў . . . 142
У пошуках палешука . . . 148
Паміж палешукамі . . . 150
Унутраны моўны падзел Палесься . . . 155
Палешукі ды іхныя суседзі . . . 159
Нацыянальнае пытаньне Палесься . . . 162
Палеская настальгія і распад этнічнай групы . . . 168

**Народ бяз бацькаўшчыны. Дадатак . . . 172**

Этнічная праблема Палесься . . . 172
Этнічныя адрозьненьні ды нацыянальная сьвядомасьць . . . 172
Праблема аб’ектыўных крытэраў . . . 174
Гістарычны аб’ектывізм. Гістарычныя і палеаэтналягічныя дасьледаваньні . . . 175
Лінгвістычны аб’ектывізм . . . 176
Крытыка лінгвістычнага падзелу этнічнага Палесься . . . 177
Агульныя разважаньні. [Крытыка аб’ектыўнай лінгвістыкі] . . . 181
Этнаграфічны аб’ектывізм. Этнаграфічная разнастайнасьць Палесься . . . 187
Этнагеаграфічная тэорыя культуры . . . 190
Агульныя высновы . . . 194
[Пастаноўка этнічнай праблемы Палесься] . . . 195
Палявы падыход . . . 196
Вобраз палешука . . . 197
Этнічны падзел Палесься . . . 199
Шматаблічнасьць этнічнай групы . . . 214
Мова . . . 217
Народная культура як нацыянальная каштоўнасьць . . . 218
Heimatliebe . . . 219

## КРЫТЫКА

**ТАЦЯНА ВАЛОДЗІНА. Прыклад высокага прафэсіяналізму . . . 221**

## ГІСТОРЫЯ

**НАТАЛЬЛЯ СЬЛІЖ. Малодшая галіна княжацкага роду Саламярэцкіх на Піншчыне . . . 225**

**Дадатак. Радавод малодшай галіны Саламярэцкіх . . . 233**

**СТАНІСЛАЎ ЧАРОПКА. Палесьсе ў полымі войнаў сярэдзіны XVII стагодзьдзя . . . 235**

**ВОЛЬГА САБАЛЕЎСКАЯ. «Як сьлімак у шкарлупіне...». Культура штодзённага жыцьця берасьцейскіх габрэяў у першай палове XIX ст. . . . . . 270**
Тэма штодзённасьці як прадмет для роздуму . . . . . 270
Ва ўмовах «лішку сацыяльнага жыцьця» . . . . . 272
Кіраўніцтва «талмудычнай рэспублікі» . . . . . 279
Унутрыкагальныя войны . . . . . 282
Усерасейскія «славутасьці» ў Берасьці . . . . . 283
Дзень будзённы — дзень працоўны . . . . . 285
Рэлігійнае жыцьцё . . . . . 292
Вялікае перасяленьне габрэяў . . . . . 296
Старое і новае ў галіне адукацыі . . . . . 297
Падсумаваньне . . . . . 299
**СЯРГЕЙ ПІВАВАРЧЫК. Крэпасьць «Палесьсе» . . . . . 301**
**АНДРЭЙ КІШТЫМАЎ. Палеская чыгуначная легенда . . . . . 313**
**ДАРОТА МІХАЛЮК. Спрэчка адносна Палесься і спроба вызначэньня дзяржаўнай мяжы паміж БНР і УНР вясной 1918 г. . . . . . 329**
**ВАЛЯНЦІНА ЛЕБЕДЗЕВА. «Украінская» ўлада на беларускім Палесьсі. Гомельская гарадзкая Дырэкторыя (1918—1919 гг.) . . . 356**
**ВОЙЦЕХ СЬЛЯШЫНСКІ. Палесьсе ў палітыцы польскай дзяржавы ў 1918—1939 гг. . . . . . 370**
**ТАЦЯНА ЛІСОЎСКАЯ. Нэапратэстанцкі рух на Палесьсі з канца XIX ст. да 1939 году . . . . . 383**
Распаўсюджанне нэапратэстантызму на беларускім Палесьсі ў канцы XIX — пачатку XX стст. . . . . . 383
Разьвіцьцё нэапратэстанцкага руху на Палесьсі ў міжваенны пэрыяд . . . . . 385
Дадаткі . . . . . 399
**АЛЕСЬ СМАЛЯНЧУК. Палескія Скірмунты: трагедыя восені 1939 году . . . . . 401**
**СТАНІСЛАЎ СІЛЬВАНОВІЧ. Польскае насельніцтва на тэрыторыі заходняга Палесься напярэдадні і ў пачатку Другой сусьветнай вайны . . . . . 410**
**ЗЬМІЦЕР КРЫВАШЭЙ. Пінск: партрэт пасьляваеннага гораду . . 426**
Эцюд першы: рэалізм працоўнага подзьвігу . . . . . 426
Эцюд другі. Насельніцтва . . . . . 430
Эцюд трэці. Крытычны . . . . . 431
Эцюд чацьвёрты. Пабытовы . . . . . 436
Эцюд пяты. Спажывецка-гандлёвы . . . . . 438
Эцюд шосты. Адукацыйна-культурны . . . . . 442
Выснова. «Карціна алеем» . . . . . 445

**АНДРЭЙ БОДАК. Народ і ўлада на Заходнім Палесьсі ў першыя пасьляваенныя гады. На прыкладзе Дзівінскага раёну Берасьцейскай вобласці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 446**

## ПАЛЕМІКА

**АЛЯКСАНДАР ІЛЫН. Кропку ставіць пакуль рана . . . . . . . . . . . . . 457**

## IN MEMORIAM

**УЛАДЗІМЕР ЛЯХОЎСКІ. Памяці Аляксандры Гесь . . . . . . . . . . . . . 463**

**СЯРГЕЙ ПІВАВАРЧЫК**

# Крэпасць «Палессе»

Палессе з прычыны сваіх спецыфічных якасцяў ёсць асаблівым аперацыйным раёнам. Палеская нізіна сваёй канфігурацыяй падобна на трапецыю — калі на лініі Буга яе шырыня складае 110 км, дык на ўзроўні Дняпра павелічваецца да 400 км. Стратэгічнаю воссю гэтай тэрыторыі ёсць лінія Брэст — Лоеў даўжынёю каля 450 км, якая супадае з рачным шляхам Мухавец — Каралеўскі канал — Прыпяць і чыгуначным Брэст — Лунінец — Мазыр.

Самую вялікую перашкоду на Палессі стваралі балоты і рэкі, найперш Прыпяць з прытокамі. Характэрная асаблівасць большасці прытокаў Прыпяці — іх паўднёвы кірунак. Гарынь, Случ, Стаход, Цна, Ясельда маглі выкарыстоўвацца як абарончая лінія. Высокі заходні бераг гэтых рэк быў асабліва каштоўны падчас абароны ад праціўніка з усходу. Густая сетка балотаў, невялікіх рэк, крыніцаў і каналаў з густою раслiннасцю стварала такія перашкоды, праз якія магчыма было прайсці хіба толькі ў вялікія маразы. Перш за ўсё гэта тычыцца цэнтральнай часткі Палесся, раёна паміж Пінскам і лініяй рэк Пціч — Убарць. Абшары на ўсход і захад ад гэтага раёна больш даступныя для чалавека.

Спецыфічны клімат Палесся, перш за ўсё высокая вільготнасць, спрыяў распаўсюджванню тут такіх хваробаў, як малярыя, тыфус, ліхаманка. Сухія месцы на Палессі ствараюць дзюны і пясчаныя ўзвышшы. Сярод найбольш значных неабходна назваць Загароддзе, Мазырскую і Оўруцкую грады, дзюнавыя ўзвышшы Гарыні, Случы, Стыра, а таксама ў раёнах Століна і Давыд-Гарадка.

Значэнне Палесся як натуральнай перашкоды падчас ваенных дзеянняў было ацэненае яшчэ ў даўнія часы. З гэтым лічыліся ўсе, хто выпраўляўся ў паходы на Беларусь. Таму ваенныя шляхі, як правіла, праходзілі па ўскраінах Палесся. Але імклівае развіццё ваеннай навукі ў XIX ст., Першая сусветная і савецка-польская войны паказалі, што такі спецыфічны абшар, які служыў заслонаю, на якую маглі абапірацца паўднёвы ці паўночны флангі фронту, стварае адмысловыя аперацыйныя і тактычныя ўмовы для вядзення баявых дзеянняў.

**Сяргей Піваварчык** — гісторык, загадчык катэдры археалёгіі і этналёгіі Гарадзенскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Янкі Купалы, доктар гістарычных навук. Займаецца вывучэньнем помнікаў фартыфікацыі Беларусі эпохі Сярэднявечча, Новага і Найноўшага часу. У 2006 г. выдаў манаграфію «Белорусские земли в системе фортификационного строительства Российской империи и СССР (1772—1941)».

Адным з найважнейшых элементаў падрыхтоўкі да вайны ў гэты час становіцца фартыфікацыйнае ўмацаванне тэрыторыі. Кожная з уладаў, якія змянялі на Палессі адна адну, спрабавалі ператварыць яго ў крэпасць, спалучыўшы натуральныя абарончыя якасці са штучнымі формамі доўгачасовай абароны.

Стратэгічнае значэнне Палесся добра разумелі і расійскія ўлады, калі ў выніку Трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у Цэнтральнай Еўропе змянілася геапалітычная сітуацыя і ўсталявалася новая мяжа Расійскай імперыі з заходнімі суседзямі. Усё Палессе ўвайшло тады ў склад Расійскай імперыі. Цяпер расійска-пруская мяжа праходзіла ўздоўж Нёмана ад Палангі да Гродна і далей проста да горада Нямірава. Буг ад вытокаў да Нямірава падзяляў Расію і Аўстрыю. Здавалася, што заходняя мяжа Расіі стабільная і змяняцца ўжо не будзе. Таму вышэйшыя расійскія вайсковыя ўлады прыступілі да працаў, звязаных з аховаю новай мяжы імперыі. Адным з важных элементаў забеспячэння мяжы было будаванне крэпасцяў. У адпаведнасці з ідэямі рускага ваеннага мастацтва, крэпасці мелі служыць апорнымі пунктамі для палявых войскаў і размяшчацца на аперацыйных кірунках, прыкрываючы актыўнымі дзеяннямі сваіх гарнізонаў разгортванне палявой арміі для нанясення контрудару па агрэсару.

Пачатак планам фартыфікацыйнага ўмацавання беларускіх земляў расійскімі ўладамі быў пакладзены ў 1796 г. Тады была створаная спецыяльная камісія пад кіраўніцтвам шэфа Корпуса інжынераў генерал-маёра інжынера Пятра Сухтэлена. На заходнюю мяжу для вывучэння сітуацыі быў накіраваны інжынер-капітан Карл Оперман. Вынікам ягонай працы стала інструкцыя «Забеспячэнне новай мяжы з Прусіяй і Аўстрыяй». Ён прапанаваў на працягу 1200 км пабудаваць дзевяць крэпасцяў: у Лібаве, Коўне, Мерачы, Гродне, Брэст-Літоўску, Луцку, Лановічах, Камянцы-Падольскім, Сароках[1].

Калі прааналізаваць гэты план, то атрымліваецца, што па лініі Нёмана на працягласці 150 км планаваліся тры крэпасці (Коўна, Мерач, Гродна) — у сярэднім адна крэпасць на 50 км. На астатніх 1000 км меркавалася ўзвесці шэсць крэпасцяў, ці адну на 150—200 км. Такая дыспрапорцыя вынікала са стратэгічнай важнасці паўночна-заходняй часткі тэатру баявых дзеянняў. Расійскія вайскоўцы бралі пад увагу тое, што цягам некалькіх стагоддзяў усе вайсковыя кампаніі, у якіх так ці інакш вырашаўся лёс Расіі, адбываліся на поўнач ад палескіх балотаў.

Далей распрацоўку фартыфікацыйнага ўмацавання заходняй мяжы імперыі працягваў генерал-маёр інжынер Франц Дэвалан. У сваім праекце ў 1797 г. ён прапанаваў цэлую абарончую сістэму з крэпасцяў, якія ўтваралі тры лініі. Згодна з ягоным планам, першая лінія адпавядала праекту К. Опермана, другая размяшчалася на адлегласці 80—100 км і ўключала крэпасці-склады ў Ворнях, Вільні і Слоніме, а трэцяя складалася з першакласных крэпасцяў у Рызе і Кіеве. Такі

[1] Піваварчык С. А. Беларускія землі ў планах фартыфікацыйнага ўмацавання заходняй мяжы Расійскай імперыі (1795—1915 гг) // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 1. Гісторыя. Палітталогія. Філасофія. Сацыялогія. Правазнаўства. Філалогія. 2002. № 2. С. 16—22.

спосаб абароны мяжы дазваляў у залежнасці ад палітычна-вайсковай сітуацыі даволі гнутка будаваць тактыку і абароны, і наступлення. У тым жа самым 1797 г. пачаліся працы дзеля рэалізацыі названых вышэй планаў, аднак канчаткова яны завершаныя не былі. Расія, якая вяла шматлікія войны, сродкаў на рэалізацыю планаў фартыфікацыйнага ўмацавання (а кошт працаў быў вельмі высокі) на той час ужо не мела. Акрамя сродкаў, не хапала і адпаведных кваліфікаваных кадраў для крэпаснога будаўніцтва, бо вяліся пераважна наступальныя войны, і інжынерных частак было няшмат. Панаванне імператара Паўла I не спрыяла якім-небудзь практычным дзеянням для ўзмацнення заходняй мяжы, і шмат хто з расійскіх вайсковых інжынераў выйшаў у адстаўку.

У 1801 г., пасля ўступлення на трон імператара Аляксандра I, сітуацыя пачала мяняцца. Пачалася рэарганізацыя і мадэрнізацыя войска, на службу вярнуліся многія афіцэры. Дайшла чарга і да разумення важнасці фартыфікацыйнага ўмацавання мяжы з заходнімі суседзямі. У 1804 г. інспектар корпуса інжынераў генерал П. Сухтэлен атрымаў дазвол на стварэнне Інжынернай экспедыцыі для працаў у заходніх губернях, аднак вайна з Францыяй у 1805—1807 гг. не дазволіла іх скончыць, а далучэнне да кантынентальнай блакады супраць Англіі прымусіла расійскіх вайскоўцаў звярнуць увагу найперш на ўмацаванне ўзбярэжжа.

Пасля французска-аўстрыйскай вайны 1809 г. стала зразумела, што канфлікт паміж Францыяй і Расіяй непазбежны. З 1810 г. Расія пачала інтэнсіўна рыхтавацца да вайны. У склад камісіі дзеля падрыхтоўкі да баявых дзеянняў быў уключаны генерал-маёр інжынер К. Оперман, які тэрмінова вярнуўся да плану стварэння фартыфікацыяў на захадзе: у Коўне, Вільні, Гродне і Брэст-Літоўску.

Аднак канчатковае рашэнне было іншае: новыя крэпасці пабудавалі ў глыбіні імперыі — Дынабургу і Бабруйску, з перадмаставым умацаваннем у Барысаве. Пры гэтым існавалі альтэрнатыўныя варыянты — Дынабург — Полацк, Бабруйск — Рагачоў, але Оперману ўдалося пераканаць начальства прыняць рашэнне на карысць першага. Бабруйская крэпасць мела служыць апорным пунктам у Палессі ды плацдармам для збору войскаў у выпадку вайны Расіі на захадзе. Працы тут вяліся вельмі інтэнсіўна, у выніку чаго да лета 1812 г. крэпасць у Бабруйску прывялі ў абарончы стан, і яна выканала важную стратэгічную ролю ў вайне з Напалеонам.

Пасля Венскага кангрэса 1815 г. заходняя мяжа Расіі змянілася ў сувязі з уключэннем у яе склад Варшаўскага герцагства. Новая тэрыторыя вялікім прастакутнікам урэзалася паміж Прусіяй і Аўстрыяй, утвараючы перадавы тэатр ваенных дзеянняў, які меў вырашальнае значэнне для паўночна-заходняга і паўднёва-заходняга ўчасткаў мяжы.

Да пытання ўмацавання заходняй мяжы зноў вярнуліся ў 1816 г., стварыўшы камітэт для разгляду стану расійскіх крэпасцяў. Гэты камітэт пад старшынёўствам дырэктара Інжынернага дэпартамента К. Опермана распрацаваў падрабязную ведамасць з пералікам усіх крэпасцяў Расійскай імперыі і ацэнкаю значэння кожнай для сістэмы абароны дзяржавы. Большасць сяброў камітэта выказалася супраць наяўнай сістэмы абароны заходняй мяжы і прызнавала, што новыя

крэпасці не адпавядалі свайму прызначэнню. Дынабург, Барысаў і Бабруйск, а тым больш Кіеў і Рыга былі занадта аддаленыя ад мяжы, каб служыць палявой арміі. Было выказана меркаванне, што варта было б спыніць далейшае развіццё згаданых крэпасцяў, а грошы выкарыстаць для заснавання новых у Коўне, Брэст-Літоўску, Пінску і Луцку. Нельга не адзначыць слушнасці прапановаў камітэта, бо яны былі часткова рэалізаваныя пазней, хоць будаўніцтва Бабруйскай і Дынабургскай крэпасцяў, якія ўжо страцілі сваё стратэгічнае значэнне, усё адно працягвалася да канца 1830-х гг., выпампоўваючы з казны вялікія фінансавыя сродкі.

Зноў да прапановаў камітэта вярнуліся пасля таго, як імператарам стаў Мікалай I. У 1827 г. была створаная камісія для высвятлення стратэгічнага значэння фартыфікацыяў, якія ўжо існавалі, і распрацавання новых. Менавіта тады і з'явіўся тэрмін «перадавы тэатр ваенных дзеянняў» (ТВД) у дачыненні тэрыторыі паміж рэкамі Вісла, Нёман і Буг. Перадавы ТВД баў асноваю абароны ўсёй заходняй прасторы ад Балтыйскага мора да турэцкай мяжы, і яго неабходна было падрыхтаваць для абарончых і наступальных дзеянняў. Перадавы тэатр мусіў быць падрыхтаваны найперш у фартыфікацыйных адносінах і мець крэпасці, якія служылі б бяспечнымі пунктамі для вядзення баявых дзеянняў. Меркавалася пабудаваць шэраг умацаванняў, якія былі аб'яднаныя агульнай стратэгічнай задумай і складалі своеасаблівы ўмацаваны плацдарм. У камісіі адразу распачалася дыскусія, дзе будаваць новую крэпасць — у Брэсце ці ў Гродне. Праектныя працы праводзіліся адначасова ў дачыненні двух гарадоў, але практычна рэалізавалася пабудова крэпасці ў Брэст-Літоўску.

Праект крэпасці быў складзены ў 1829 г. генераламі Карлам Оперманам і Мікалаем Малецкім, а таксама палкоўнікам А. Фельдманам. Пасля ён быў выпраўлены і зацверджаны ў 1830 г. імператарам Мікалаем I. Паўстанне 1831 г. трохі адсунула тэрмін пачатку будаўніцтва, але ў той жа час канчаткова пераканала царскі ўрад у слушнасці ўзвядзення крэпасці ў заходняй Беларусі ў якасці апоры царызму на гэтых землях. У 1832 г. нагляд за будаўніцтвам быў ускладзены на генерал-фельдмаршала Івана Паскевіча, і пачаліся земляныя працы на месцы старажытнага горада. 1 чэрвеня 1836 г. заклалі першы камень, а праз шэсць гадоў пабудова асноўных умацаванняў была завершаная. 26 красавіка 1842 г. крэпасць у Брэст-Літоўску была ўведзеная ў баявыя разлікі расійскай арміі. Неабходна адзначыць, што Брэсцкая крэпасць фактычна бесперапынна будавалася з 1832 г. да 1915 г., там праводзіліся працы дзеля ўдасканалення старых і пабудовы новых фартоў. З 1864 да 1883 гг. прайшла яе рэканструкцыя ў адпаведнасці з запіскаю генерала Эдуарда Татлебена аб мадэрнізацыі расійскіх крэпасцяў (1862).

Праца згаданай камісіі працягвалася да 1833 г., а паўстанне 1830—1831 гг., безумоўна, паўплывала на планы далейшага фартыфікацыйнага ўмацавання на захадзе імперыі. Пасля ліквідацыі Каралеўства Польскага стратэгічныя вайсковыя планы звязваліся з будаўніцтвам на тэрыторыі губерняў Прывісленскага краю новых крэпасцяў. Галоўнымі натуральнымі рубяжамі тут былі рэкі Вісла і Нараў. У 1832—1834 гг. была збудаваная Аляксандраўская цытадэль у Варшаве,

а ў 1848 г. на правым беразе Віслы ўзвялі перадмаставое ўмацаванне — форт Слівіцкага. Праўда, гэтая крэпасць найперш будавалася з жандарскай мэтай — трымаць у паслухмянасці Варшаву. У 1837—1847 гг. паўсталі ўмацаванні ў Дэмбліне (перайменаваным расійскімі ўладамі ў Івангорад), а з 1832 па 1841 гг. узводзілася крэпасць у Модліне (Новагеоргіеўск). Такім чынам, перад Крымскай вайной фартыфікацыйнае ўмацаванне заходняй мяжы Расійскай імперыі складалася з трох ліній: першая, перадавая, складалася з крэпасцяў у Варшаве, Івангорадзе, Новагеоргіеўску, у другую ўваходзіў Брэст-Літоўск, а трэцяя, тылавая лінія (Рыга, Дынабург, Бабруйск, Кіеў) — гэта былі вайсковыя склады і месцы разгортвання рэзерваў.

Такі стан на заходняй мяжы стаў прадметам разгляду імператара Мікалая I. Трэба адзначыць, што ён добра валодаў пытаннямі ваеннай стратэгіі ды тактыкі і асабіста быў галоўным інспектарам вайсковых інжынераў. У запісцы «Аб сістэме абароны нашых заходніх франтоў: высунутага, паўночнага і паўднёвага», напісанай у красавіку 1843 г., Мікалай I даў характарыстыку заходняй мяжы і выказаў прапановы, якія тычыліся крапаснога будаўніцтва ў Расіі. Прапановы былі вельмі цікавыя, і Палессю ў мемарыяле надавалася важнае значэнне. Дзеля таго варта працытаваць датычную Палесся частку гэтага дакумента:

*Я не буду распаўсюджвацца пра геаграфічнае становішча заходніх межаў імперыі. Дастаткова сказаць, што я лічу мяжу гэтую як бы падзеленай балотамі р. Прыпяці на дзве зоны. Паўночная зона ляжыць супраць Прусіі; паўднёвая — супраць Аўстрыі, а яшчэ далей на поўдзень — супраць Турцыі. Абедзве гэтыя амаль роўныя паміж сабою зоны сыходзяцца ў Каралеўстве Польскім, канчаючыся цячэннем Віслы.*

*З гэтага я раблю выснову: 1) што нашая высунутая пазіцыя ў бок Еўропы знаходзіцца на Вісле; 2) што базіс паўночнай зоны знаходзіцца на Дзвіне і Дняпры, абмяжоўваючыся з поўдня Прыпяццю; 3) што базіс паўднёвай зоны абапіраецца на Дняпро, абмяжоўваючыся з поўначы Прыпяццю; 4) што пунктам злучэння абедзвюх зонаў, у бок захаду, ёсць Брэст, які, дзеля гэтага ж, з усіх пунктаў заходняй мяжы імперыі ёсць самым важным, бо служыць першаасновай для нашай высунутай пазіцыі. Нашая высунутая пазіцыя на Вісле вельмі зручнаяь як пры наступальнай вайне, так і пры вайне выключна абарончай.* […]

*Левае крыло нашай перадавой пазіцыі заканчваецца Івангорадам на р. Вепш, ці, самае большае, можа быць працягнутае да Замосця; але адсюль да Кіева мы не маем ніводнага ўмацаванага пункта. Аўстрыйская мяжа выдаецца наперад амаль у выглядзе прастакутніка і да такой ступені адцясняе нашую паўднёвую зону да балотаў р. Прыпяці, што непрыяцельская армія можа ад мяжы дасягнуць за два пераходы Дубна і Астрога, на брэсцка-кіеўскай дарозе, і адрэзаць нас такім чынам ад адзінага нашага базісу — Кіева. Відавочна, значыць, што перш за ўсё належыць забяспечыць гэты пункт і, так бы мовіць, ураўнаважыць яго сіламі з астатняй часткай нашай мяжы. Я раблю выснову, што паміж Дубнам і Астрогам патрэбная крэпасць, якая мае прыкрываць*

*наш ваенны шлях з Брэста ў Кіеў і служыць для нас апорным пунктам у тым выпадку, калі б нам давялося манеўраваць. Як толькі зробім выбар паміж Дубнам і Астрогам, трэба будзе стварыць злучальную шашу паміж выбраным пунктам і шашою, якая вядзе з Брэста ў Бабруйск. У гэтым пытанні паказваюць заўсёды на Пінск; я не выказваюся канчаткова ні на карысць гэтага, ні на карысць другога пункта, спрыяльнейшага для ўладкавання дарогі; скажу толькі, што кірунак гэты падаецца мне правільным. На пункце гэтым трэба будзе зладзіць падвойны тэт-дэ-пон[2], але без асабліва дарагіх працаў. Неабходна мець і яшчэ адзін пункт, які ляжыць больш ззаду, як, напрыклад, Мазыр. Не выказваюся адносна ягоных мясцовых пераваган; аднак кірунак гэты, як падаецца, выбраны ўдала. Ва ўсялякім выпадку, давядзецца зрабіць шашу на правым беразе Бярэзіны, бо пункт пераправы знаходзіцца ўжо каля Бабруйска; затым шаша гэтая далучыцца да такой самай, якая вядзе з Брэста ў Кіеў, верагодна, каля Жытоміра (гэта трэба яшчэ вызначыць рэкагнасцыроўкамі). Тады было б, можа, пажадана ўладкаваць там крэпасць другога класу, але гэтая пабудова была б самай апошняй. Таксама і ў Мазыры можна было б задаволіцца падвоеным тэт-дэ-понам, таннага ўладкавання.*

*Згодна з гэтым разлікам, нам спатрэбіцца 6 новых крэпасцяў: 1) каля Гродна; 2) каля Мінска; 3) каля Дубна; 4) на Днястры; 5) каля Пінска; 6) каля Мазыра. Адпаведна іх важнасці, 1-я, якую трэба пабудаваць, гэта Дубна, 2-я — Гродна, 3-я — на Днястры, 4-я — Пінск, 5-я — Мазыр, апошняя — Мінск і, магчыма, пасля — Жытомір. Шашы будуць пабудаваныя: 1) ад Беластока да новай крэпасці ў Гродна, таксама на Мінск і Бабруйск; 2) ад Брэста да Гродна; 3) ад Брэста ў Кіеў; 4) ад Кіева да Днястра; 5) ад Пінска да Дубна; 6) ад Бабруйска ў Мазыр, да Брэсцка-Кіеўскай шашы[3].*

Гэты праект з розных прычынаў у той час не рэалізаваўся, аднак некаторыя з прапановаў (будаўніцтва крэпасцяў у Дубне і ў Гродне, пабудова шашэйных дарогаў і чыгункі) будуць рэалізаваныя ў другой палове XIX — пачатку XX стст.

У канцы XIX ст. стратэгічнае значэнне Палесся ў аператыўных планах Расійскай імперыі паменшала. Звязана гэта было са зменаю замежнай палітыкі краіны. У 1880 г. начальнікам Галоўнага штаба Мікалаем Обручавым былі распрацаваны, а пазней і зацверджаны імператарам такі дакумент, як «Соображения о планах ведения войны». План дзеянняў на еўрапейскім тэатры ваенных дзеянняў быў накіраваны супраць кааліцыі еўрапейскіх дзяржаваў. У 1879 г. сфармаваўся Двайны саюз, які неўзабаве пераўтварыўся ў Трайны: Германія, Аўстра-Венгрыя, Італія. На думку генерала Обручава, на пачатку кампаніі трэба было б весці абарончыя дзеянні супраць Германіі і наступальныя супраць Аўстра-Венгрыі. Галоўныя сілы расійскіх войскаў неабходна разгортваць на

[2] Тэт-дэ-пон (з франц. *tête de pont*) — умацаванне моста для аховы пераправаў.

[3] Мемориал императора Николая I «О системе обороны наших западных фронтов: выдвинутого, северного и южного». Гл.: http://www.fortification.ru/oldforum/index.php?action=vthread&forum=20&topic=42.

берагах Віслы, дзе былі пабудаваныя тры моцныя крэпасці: Новагеоргіеўск, Варшава, Івангорад. Гэтыя крэпасці былі плацдармам для наступу і ў той жа час сур'ёзнай перашкодай для праціўніка ў выпадку фарсавання ім Віслы. Правы фланг Прывісленскага раёна з боку Усходняй Прусіі планавалася забяспечыць натуральным абарончым рубяжом — лініяй рэк Бобр, Буг, Нараў, узмоцненай крэпасцямі Асавец, Ломжа, Астраленка, Ражаны і Пултуск. Забеспячэнне левага флангу ўскладалася толькі на адну крэпасць Брэст-Літоўск, бо менавіта тут меркаваўся наступ у першую чаргу, і Палессе заставалася ў глыбокім тыле. Такі падрабязна распрацаваны план вайны ў Расіі з'явіўся ўпершыню, а ўсе наступныя планы (1896, 1908, 1910, 1914) адрозніваліся адно некаторымі дэталямі без істотных зменаў асноўнай ідэі.

Фартыфікацыйнае забеспячэнне заходняга ТВД Расіі на пачатку XX ст. было сістэмным. У цэнтры ўтварыўся Прывісленскі (Варшаўскі) умацаваны раён з асноўнымі крэпасцямі Новагеоргіеўск, Варшава, Івангорад. Акрамя гэтага, для забеспячэння пераправаў пабудавалі крэпасці Асавец, Загжэ, Ломжа, Астраленка, Ражаны і Пултуск. На паўночны ўсход ад Прывісленскага раёна, прыкрываючы яго правы фланг і шляхі на Пецярбург, знаходзілася абарончая лінія Нёмана з умацаваннямі Коўна, Аліта і Гродна. Паўднёвы фланг Прывісленскага раёна меў умацаванне ў выглядзе Роўна-Дубненскага вузла і крэпасці Брэст-Літоўск на Бузе. У тыле размяшчаліся старыя крэпасці-склады Дзвінск, Бабруйск і Кіеў. Такім чынам, Палессю адводзілася роля натуральнай крэпасці-перашкоды ў выпадку ўзброенага канфлікту ў Еўропе. Расійскае кіраўніцтва і думкі не дапускала, што войскі праціўніка змогуць уварвацца на тэрыторыю Расіі вельмі глыбока. Сістэма ўмацаванняў заходняй мяжы Расіі, прыкрываючы канцэнтрацыю войска ў міжрэччы Віслы і Нёмана, магла служыць выдатным плацдармам для актыўных дзеянняў супраць Германіі.

Прыкладны кошт пабудовы, абсталявання і ўтрымання гарнізонаў крэпасцяў на заходняй граніцы Расіі вызначылі на 250 млн рублёў. Значная частка фінансавых сродкаў была накіраваная на мадэрнізацыю Брэст-Літоўскай крэпасці. Брэст-Літоўск быў важным камунікацыйным вузлом і левафлангавым пунктам на лініі разгортвання рускіх арміяў паводле плану 1910 г. У 1912 г. быў зацверджаны генеральны план пашырэння крэпасці на перыяд 1912—1921 гг. Летам 1913 г. пачалося будаванне новых умацаванняў, якое не спынілася і з пачаткам Першай сусветнай вайны. Да жніўня 1915 г. працы ў крэпасці была амаль завершаныя. Яе ўмацаванні складаліся з 14 фартоў, 21 апорнага пункта пры агульнай працягласці ўмацаванняў 45 км. Брэст-Літоўск стаў самай дасканалай і падрыхтаванай да абароны крэпасцю на захадзе Расіі. Аднак у жніўні 1915 г. на загад Вярхоўнага камандавання гарнізон, узбраенне і маёмасць крэпасці былі эвакуяваныя, а частка ўмацаванняў узарваная.

У выніку германскага наступлення летам 1915 г. расійскія войскі былі вымушаныя адступаць у глыб сваёй тэрыторыі ды пакінуць усе крэпасці на заходнім тэатры ваенных дзеянняў — Івангорад, Варшава, Новагеоргіеўск, Асавец, Коўна, Гродна, Брэст-Літоўск. Пасля ліквідацыі рускімі войскамі Свянцянскага прарыву немцаў восенню 1915 г. баі прынялі лакальны характар, і ў хуткім часе абодва бакі

перайшлі да пазіцыйнай вайны. Лінія размяшчэння праціўнікаў цягнулася па Заходняй Дзвіне ад Рыгі да Дзвінска і далей амаль па простай лініі на Паставы, Крэва, Баранавічы, Пінск, Дубна, Бучач і Наваселіцы. Рускі фронт пераўтварыўся ў пазіцыйны, а Палессе пры гэтым падзялілася амаль пасярэдзіне.

Пазіцыйная вайна патрабавала новых спосабаў вядзення баявых дзеянняў, найперш стварэння сістэмы фартыфікацыйнага ўмацавання лініі фронту. Рускія, германскія і аўстрыйскія войскі заняліся абарончым будаўніцтвам на сваіх пазіцыях. Бяспечнае, зручнае і нават прыемнае знаходжанне на пазіцыях было абавязкам усіх частак германскай і аўстрыйскай арміяў. Падтрыманне парадку і чысціні патрабаваліся на пазіцыях яшчэ стражэй, чым у тыле. Падрабязна распрацаваны парадак, які больш нагадваў шаблон, назіраўся на саміх умацаваннях: паўсюль імкнуліся выкарыстоўваць толькі выпрабаваныя тыповыя збудаванні паводле зацверджаных праектаў. Гэта мела перавагу перад шырокай свабодай праяваў ініцыятывы і фантазіі кожным будаўніком і вайсковым начальнікам. Змяняючы пазіцыі, войскі знаходзілі на сваіх новых участках такія самыя пабудовы, як і на папярэдніх. Новым быў толькі план участка і сілы ўмацавання, якія залежалі выключна ад мясцовасці і мэты ўмацавання. Разам на рускім фронце германскія і аўстрыйскія войскі пабудавалі каля 3500 баявых, назіральных і жылых доўгачасовых (жалезабетонных) фартыфікацыйных збудаванняў.

Аперацыі пад Баранавічамі ў 1916 г. паказалі поўную няздатнасць царскай арміі прарваць моцна ўмацаваны пазіцыйны фронт германцаў. Рэшткі германскіх пазіцыяў з бетоннымі ўмацаваннямі дагэтуль захаваліся ў раёне Баранавічаў, Ганцавічаў, Целяханаў, каля Выганашчанскага возера.

Першая сусветная вайна стала для крэпасцяў усіх дзяржаваў баявым экзаменам, якога яны не вытрымалі. Крэпасці Гродна і Брэст-Літоўск былі пакінутыя расійскімі войскамі амаль без бою. Прычына непрыдатнасці адзінкавых крэпасцяў была ў тым, што яны ўжо не адпавядалі ранейшай стратэгіі вядзення вайны. Буйныя арміі, разгорнутыя на вялікіх ТВД, абыходзілі такія крэпасці. Каб спыніць моцнае войска праціўніка, патрабаваліся суцэльныя пазіцыі ці лініі. З досведу Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў вынікала, што найлепшаю формаю ваенна-інжынернай падрыхтоўкі памежнай паласы з’яўляецца сістэма ўмацаваных раёнаў (УРаў), якія прыкрывалі найважнейшыя аперацыйныя кірункі, што вялі ўглыб краіны.

Пасля Рыжскага дагавору беларускія і ўкраінскія землі былі падзеленыя паміж Польшчай і Савецкім Саюзам, якія ў стратэгічных планах разглядалі адзін аднаго як праціўнікаў падчас верагоднага канфлікту. Мяжа паміж СССР і Польшчай (1400 км ад Дзвіны на поўначы да Днястра на поўдні) дзялілася геаграфічна на тры ўчасткі: паўночны (беларуска-літоўскі ад Дзвіны да шашы Брэст — Слуцк працягласцю 500 км), цэнтральны (палескі ад Случы, працягласць — 391 км) і паўднёвы (украінскі да Днястра, працягласць 512 км). Улічваючы геапалітычнае становішча, савецкія вайсковыя тэарэтыкі адводзілі Беларусі ў сваіх стратэгічных планах ролю будучага тэатра ваенных дзеянняў, таму канцэнтрацыя войскаў тут была вельмі высокая.

Трэба адзначыць, што праблема фартыфікацыйнага ўмацавання межаў СССР была цесна звязаная з праблемай «пачатковага перыяду вайны». З до-

сведу Першай сусветнай вайны лічылася, што гэты перыяд будзе ахопліваць час ад абвяшчэння вайны да завяршэння разгортвання і пачатку вырашальных аперацыяў галоўных сілаў варожых бакоў. У 1920—1930-я гг. савецкія ваенныя тэарэтыкі ды военачальнікі (Міхаіл Тухачэўскі, Аляксандр Ягораў, Роберт Эйдэман, Барыс Шапашнікаў, Яўген Шылоўскі і інш.) у сваіх працах разглядалі розныя аспекты пачатковага перыяду вайны. Яны прыйшлі да высновы, што галоўнае ў пачатковым перыядзе — надзейна затрымаць агрэсара ў памежных раёнах, каб мець час на мабілізацыю і разгарнуць войскі. Для гэтага прапаноўвалася цэлая сістэма мерапрыемстваў ваеннага і арганізацыйнага характару, найважнейшыя з якіх — маштабнае будаванне ўмацаваных раёнаў уздоўж лініі дзяржаўнай мяжы.

Распрацоўваць праблемы глабальнай фартыфікацыі межаў савецкіх рэспублік у штабе Чырвонай Арміі пачалі ў пачатку 1920-х гг., фактычна адразу пасля завяршэння грамадзянскай вайны. Тады з'явіўся шэраг тэарэтычных распрацовак, аўтары якіх імкнуліся вызначыць канцэптуальную скіраванасць ваенна-інжынернага забеспячэння СССР на выпадак магчымай вайны (Георгій Неўскі, Фёдар Галенкін, Сяргей Хмялькоў, Іван Бялінскі).

Практычную рэалізацыю фартыфікацыйнага ўмацавання межаў СССР улады пачалі ў канцы 1920-х гг., калі краіна стала набіраць эканамічную моц. Заходняя мяжа СССР мела працягласць каля 3000 км, таму пабудаваць суцэльную лінію фартыфікацыяў было нерэальна. У адпаведнасці з распрацаванымі тэарэтычнымі поглядамі асобныя доўгачасовыя ўмацаваныя раёны будаваліся на найважнейшых аперацыйных кірунках, што вялі ў глыбіню савецкай тэрыторыі, на значнай адлегласці паміж флангамі УРаў. Такая сістэма была разлічаная на цеснае ўзаемадзеянне ураўскіх гарнізонаў з палявымі войскамі ды адпавядала характару пачатковага перыяду вайны пры вялікай працягласці межаў СССР. Перад УРамі ставілася задача — затрымаць праціўніка на пэўны час, неабходны на мабілізацыю і нанясенне контрудара ў адпаведнасці з уласнымі аперацыйнымі планамі.

Падрыхтоўка да абарончага будаўніцтва на сухапутных межах СССР разгарнулася з 1927 г. У сакавіку 1929 г. начальнік штаба Чырвонай Арміі Клімент Варашылаў зацвердзіў асноўныя палажэнні інжынернай падрыхтоўкі УРаў. У 1929—1932 гг. у трох вайсковых акругах былі створаныя чатыры ўмацаваныя раёны, з якіх два ў Беларусі — Полацкі і Мазырскі. Усе яны эксплуатаваліся і ўяўлялі з сябе лінію жалезабетонных збудаванняў, размешчаных на глыбіні ад аднаго да двух кіламетраў. Асноўным тыпам баявога ўзбраення быў кулямётны доўгачасовы агнявы пункт (паводле расійскай ваенна-інжынернай тэрміналогіі ДОТ — *долговременная огневая точка*). Доўгачасовых збудаванняў, якія маглі вытрымаць 155- і 210-міліметровыя снарады, налічваліся адзінкі. Яны мала адпавядалі патрабаванням часу, бо былі разлічаныя на франтальны кулямётны агонь, мелі слабую адпорнасць збудаванняў і малаэфектыўнае ўнутранае абсталяванне[4].

[4] Піваварчык С. А. Беларусь у планах фартыфікацыйнага ўмацавання заходняй мяжы Савецкага Саюза (1926—1941 гг.) // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 1. Гісторыя. Паліталогія. Філасофія. Сацыялогія. Правазнаўства. Філалогія. 2003. № 2 С. 6—15.

Аператыўна-тактычнае прызначэнне Мазырскага ўмацаванага раёна было ў тым, каб перакрыць усходнія выхады з Палесся і дарогі на Гомель і Жлобін. Здзіўляе выбар месца для пабудовы гэтага УРа. Савецкія стратэгі лічылі, што з прычыны адсутнасці дарог і дрэнных тапаграфічных і кліматычных умоваў Палесся буйных аперацыяў тут не будзе, а паўднёвая частка раёна стане другарадным тэатрам ваенных дзеянняў. Дзмітрый Карбышаў у артыкуле «Інжынерная падрыхтоўка межаў СССР» (1926 г.) сцвярджаў, што маладаступны раён Палесся ад Бабруйска да Корасценя пры наяўнасці ў яго тыле значнага воднага рубяжу ў выглядзе Дняпра

*папярэдняй фартыфікацыйнай падрыхтоўкі не патрабуе. У ваенны час чыгуначныя вузлы Бабруйска і Мазыра могуць быць прыкрытыя без асаблівых намаганняў палявымі пазіцыямі*[5].

Нягледзячы на меркаванне аўтарытэтнага спецыяліста, будаўніцтва магутнай умацаванай лініі на Палессі пачалося адным з першых. Магчыма, савецкія вайскоўцы не маглі забыцца пра паспяховыя дзеянні на Палессі арміі генерала Станіслава Булак-Балаховіча ў 1920 г. У выпадку вайны з Польшчаю Мазырскі УР мог стаць надзейнай абаронай манеўравай групоўкі савецкіх войскаў, якая магла дзейнічаць у фланг беларускага ці ўкраінскага кірунку ў залежнасці ад абставінаў. Асноўнае будаўніцтва Мазырскага УРа пачалося ў 1931 г. і праз год завяршылася. Але дапрацаванне і ўстаноўка ўзбраення і абсталявання працягваліся тут да 1936 г. Працягласць УРа па фронце склала 130 км, глыбіня на розных кірунках — 2—5 км, аддаленасць ад мяжы — 80 км, колькасць доўгачасовых абарончых збудаванняў — 159. Будаўніцтва Мазырскага УРа на Палессі каштавала СССР 10 700 000 рублёў. Але гэта было яшчэ не ўсё. У 1932 г. у Савецкім Саюзе пачалося будаўніцтва яшчэ дзевяці УРаў, у тым ліку Корасценскага ва Украіне, які перакрыў стратэгічныя кірункі паўднёвага Палесся. Разрыў паміж двума УРамі быў нязначны — у межах дальнасці стральбы дывізійнай артылерыі. У 1938 г. будаўнічыя часці накіравалі на ўзвядзенне Слуцкага УРа, а ў 1940 г. — у Брэсцкі УР на мяжы з Германіяй, дзе разгортвалася грандыёзнае абсталяванне новага тэатра ваенных дзеянняў.

Умацаваныя раёны, пабудаваныя ў Савецкім Саюзе ў 1928—1939 гг., у сучаснай навукова-папулярнай літаратуры маюць абагуленую назву «Лінія Сталіна». Гэты тэрмін мае сваю гісторыю. У студзені 1936 г. у рускамоўнай газеце «Сегодня», якая выдавалася ў Рызе, быў надрукаваны артыкул пад назваю «Сталін будуе лінію Мажыно ў СССР». У ім паведамлялася, што Іосіф Сталін на сесіі Вярхоўнага Савета прэзентаваў праграму пераўзбраення Чырвонай Арміі. Паводле гэтай праграмы, на заходняй і ўсходняй межах СССР на працягу трох тысяч кіламетраў планавалася пабудаваць лінію ўмацаванняў, «падобную да вя-

[5] Карбышев Д. М. Инженерная подготовка границ СССР // Карбышев Д. М. Избранные научные труды. Москва, 1962. С. 368.

домай лініі Мажына»[6]. З часам у прапагандысцкай літаратуры заходніх краінаў за савецкімі фартыфікацыйнымі збудаваннямі на мяжы да 1939 г. замацаваўся тэрмін «Лінія Сталіна» як аналаг лініяў Мажыно ў Францыі, Зігфрыда ў Германіі, Манергейма ў Фінляндыі. Гэты тэрмін увайшоў на Захадзе ў навуковую, папулярную і публіцыстычную літаратуру яшчэ да Другой сусветнай вайны, а таксама шырока выкарыстоўваўся ў фашысцкай Германіі ў прапагандысцкай літаратуры.

Не забываліся пра фартыфікацыйнае ўмацаванне сваёй усходняй мяжы і ўлады міжваеннай Польшчы. Новая савецка-польская мяжа прайшла за 20—50 км на ўсход ад лініі, дзе ў свой час стабілізаваўся фронт Першай сусветнай вайны. Лінія ўмацаваных пазіцыяў германскай арміі апынулася на тэрыторыі Польшчы. Гэтыя абставіны выкарыстала польскае вайсковае камандаванне. Пры распрацоўцы планаў магчымай вайны з СССР улічваліся геаграфічныя фактары і наяўнасць добра ўмацаваных пазіцыяў, размешчаных на адлегласці ад мяжы. У выпадку ваеннага канфлікту гэта дазваляла сканцэнтраваць войскі на найбольш небяспечным участку. У 1928—1931 гг. інспектары польскай арміі вывучылі пазіцыі, у выніку чаго была праведзеная інвентарызацыя германскіх доўгачасовых збудаванняў. Значную частку прызналі прыдатнай для выкарыстання, аднак яна патрабавала рамонту і перабудовы[7].

На працягу 1930-х гг. стратэгічныя планы і праекты ваенна-інжынернага забеспячэння ўсходняга тэатра ваенных дзеянняў Польшчы змяняліся. Адбывалася гэта пад уплывам ваенна-палітычнай сітуацыі і вопыту фартыфікацыйнага ўмацавання межаў у еўрапейскіх краінах (Францыя, Германія, СССР). Калі ў пачатку 1930-х гг. былі праведзеныя работы дзеля мадэрнізацыі германскіх умацаванняў Першай сусветнай вайны, а таксама гідратэхнічныя работы на рэках Шчары і Сэрвечы, то ў 1936—1939 гг. асноўная ўвага надавалася будаўніцтву ўмацаваных раёнаў з сучаснымі доўгачасовымі агнявымі збудаваннямі. Моцна паўплывала на польскую фартыфікацыю французская фартыфікацыйная школа і досвед будаўніцтва так званай «Лініі Мажыно».

Згодна з польскім аператыўным планам «Усход», на ўсходняй мяжы ствараліся ўчасткі абароны з інжынерным забеспячэннем (доўгачасовыя і палявыя фартыфікацыйныя збудаванні, плаціны, чыгункі ды грунтавыя дарогі, масты). Такіх участкаў было сем: «Вільня», «Баранавічы», «Лунінец», «Ганцавічы», «Сарны», «Валынь», «Падолле». Кожны раён да таго ж складаўся з падучасткаў і сектараў[8]. Паводле генеральнага праекта 1936 г., на палескім фронце на працягу 430 км (тры раёны — «Лунінец», «Ганцавічы», «Сарны») планавалася пабудаваць 660 жалезабетонных аб'ектаў. Да верасня 1939 г. палякі паспелі выканаць найбольшы аб'ём фартыфікацыйных працаў у раёне «Сарны». У сектары «Чудзель»

[6] Kaufmann J. E., Jurga R. M. Twierdza Europa. Europejskie fortyfikacje drugiej wojny światowej. Warszawa, 2002. S. 377.

[7] Pruski Z. Bastion Polesie. Polskie fortyfikacje na Polesiu w latach 1920—1939. Prasnysz, 2000. S. 16.

[8] Kot M. Wshodnie umocnienia Rzeczypopolitej. Odcinek "Baranowicze" // Archeologia Wojskowa. 1994. № 1 (4). S. 36—41.

былі пабудаваныя 102 аб'екты, у сектары «Бярэжна» — 105. А вось на ўчастках «Лунінец» і «Ганцавічы» былі толькі праведзеныя работы дзеля рэкагнасцыроўкі і складзеныя тактычна-фартыфікацыйныя планы. Асаблівую ўвагі надавалі так званаму «калідору Мокраць» паміж Прыпяццю і чыгункаю Пінск — Мазыр, дзе былі найбольш спрыяльныя геаграфічныя ўмовы для наступу праціўніка з усходу. Разам у раёнах «Лунінец» і «Ганцавічы» планавалася паставіць 267 доўгачасовых збудаванняў, а таксама правесці значныя гідратэхнічныя работы (рэгуляцыя рэк Цны, Лані, Начы, будаўніцтва каналаў і плацінаў).

Савецкае вайсковае камандаванне лічыла польскія ўмацаванні сур'ёзнай перашкодай і меркавала, што іх пераадоленне пацягне вялікія страты. Маршал Міхаіл Тухачэўскі ў сваіх паказаннях на следстве ў справе «ваеннай змовы» ў Чырвонай Арміі ў 1937 г. сцвярджаў, што камандуючы Беларускай вайсковай акругай Якім Убарэвіч распрацоўваў план авалодання польскімі ўмацаваннямі з выкарыстаннем толькі конніцы, без удзелу пяхоты. Аднак у верасні 1939 г. савецкія войскі, якія перайшлі савецка-польскую мяжу, увогуле не сустрэлі ва ўмацаваннях польскіх войскаў і бесперашкодна занялі Баранавічы, Навагрудак ды іншыя беларускія памежныя гарады. Да 17 верасня польскія войскі, якія мелі абараняць усходнюю мяжу Польшчы, былі перакінутыя на захад і змагаліся супраць нямецкіх войскаў. І толькі ў раёне горада Сарны на Палессі савецкія войскі сустрэлі супраціўленне польскіх войск (пераважна гэта былі часткі Корпуса аховы памежжа), якія занялі доўгачасовыя фартыфікацыйныя збудаванні і арганізавалі абарону.

Цікава, што ў XX ст. пры планаванні ваенных дзеянняў практычна ўсе ваенныя тэарэтыкі прызнавалі за Палессем ролю натуральнай крэпасці-перашкоды, вельмі дакладна планавалі развіццё асноўных падзеяў на поўдзень ці поўнач ад Прыпяці ды не прадугледжвалі сур'ёзных фартыфікацыйных работаў. На практыцы ж атрымалася зусім наадварот, бо ва ўмацаванне Палесся даводзілася ўвесь час укладаць вялікія сродкі. Калі паўстала пытанне пра абсталяванне так званага «Беластоцкага выступу» ў 1939—1940 гг., шмат увагі зноў надалі будаўніцтву фартыфікацыйных збудаванняў. На заходняй мяжы Беларусі сталі будаваць чатыры ўмацаваныя раёны — Гродзенскі, Асавецкі, Замбраўскі і Брэсцкі, а на тэрыторыі Украіны ў гэты самы час пачалося ўзвядзенне Ковельскага, Рава-Рускага і Перамышльскага УРаў. У выніку Палессе мусіла надзейна замыкацца дасканалай фартыфікацыйнай сістэмай, аднак яе проста не паспелі скончыць. Падамо толькі адну лічбу — на будаўніцтва Брэсцкага ўмацаванага раёна ў 1941 г. выдаткоўвалася 37 494 700 рублёў — больш, чым на які іншы[9]. На жаль, савецкае кіраўніцтва забылася пры гэтым на старую славянскую мудрасць: «Не красна засада огородой, а сильна воеводою». З пачаткам вайны жалезабетонная лінія не стала сур'ёзнай перашкодай для ворага, а Палессе з яго натуральнымі якасцямі не зрабілася надзейным домам-крэпасцю для тых, хто шукаў на яго тэрыторыі ратунку ў суровы час.

[9] Российский государственный военный архив. Ф. 36967, воп. 1, спр. 209, арк. 1 (Общее распределение ассигнований по УРам ЗапОВО).